УДК 930(476):94:334.7:338.43(476) «18/19»

***П.П. Бухавец***
*магістр гіст. навук, аспірант 2 года дзённай формы навучання*
*каф. славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка*

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ ТАВАРЫСТВАЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

*Артыкул прысвечаны разгляду сучаснай беларускай гістарыяграфіі стварэння і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў у другой палове XIX – пачатку XX стст. Агляд прац беларускіх даследчыкаў сведчыць аб ускосным вывучэнні дадзенай праблемы ў айчыннай гістарычнай навуцы. Дасюль не існуе агульнапрызнанага азначэння тэрміна «сельскагаспадарчае таварыства», што спараджае тэрміналагічную блытаніну і ўключэнне ў іх шэраг камерцыйных аб'яднанняў. Пашырэнне крыніцавай базы ў апошняй чвэрці XX ст. дазволіла акрэсліць арганізацыйны склад, структуру, асноўныя накірункі дзейнасці найбольш буйных сельскагаспадарчых таварыстваў. Разам з тым маладаследаванымі застаюцца такія аспекты, як фактар дзяржаўнай палітыкі ў працэсе стварэння сельскагаспадарчых таварыстваў, узаемаадносіны таварыстваў і вертыкалі ўлады, асабовы склад і асветніцкая дзейнасць.*

## Уводзіны

Апошнія дваццаць пяць гадоў вызначыліся павышэннем цікавасці да сацыяльна-эканамічнай, палітычнай і культурнай гісторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Айчынныя даследчыкі звярнуліся да вывучэння, бадай, адзінай легальнай магчымасці аб'яднання дваранства беларускага краю ва ўмовах абмежавальнага заканадаўства – сельскагаспадарчых таварыстваў у 70-х гг. XIX – пачатку XX стст. Гэтыя грамадскія аб'яднанні з моманту заснавання хутка ператварыліся ў асяродкі распаўсюджвання перадавых на той час сельскагаспадарчых ведаў, сталі цэнтрамі грамадскага жыцця. Іх існаванне ў значнай ступені кампенсавала адсутнасць земстваў на Беларусі. Дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў істотна садзейнічала працэсам гаспадарчай мадэрнізацыі шырокіх колаў насельніцтва.

Трэба падкрэсліць, што стварэнне і дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў у другой палове XIX – пачатку XX стст. у беларускай савецкай гістарыяграфіі спецыяльна не вывучаліся [1, с. 16–19]. Даследчыкі гісторыі Беларусі парэформеннага часу зрэдку закраналі асобныя аспекты дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў гэтага тыпу [2–4]. Сітуацыя пачала мяняцца ў другой палове 1980-х гг., калі з'явіліся першыя працы В.М. Бусько, які даследаваў эканамічныя погляды сяброў беларускіх сельскагаспадарчых таварыстваў [5; 6]. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз прац сучасных айчынных даследчыкаў, якія закранаюць праблему стварэння і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў Беларусі ў парэформенны перыяд.

Адным з першых звярнуў увагу на дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў В.П. Пічукоў. Аўтар ахарактарызаваў перыядычны друк сельскагаспадарчых таварыстваў Магілёўскай губерні. Ім быў адзначаны буржуазна-ліберальны характар выданняў, цэнтральнае месца ў якіх адводзілася аграрнаму пытанню і яго вырашэнню [7, с. 46–47; 8, с. 86–87]. Шэраг артыкулаў, прысвечаных таварыствам, з'явіўся ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Больш разгорнутую іх характарыстыку даў М.В. Верабей у артыкуле, прысвечаным Віцебскаму таварыству сельскіх гаспадароў. Але дзейнасць таварыства

Навуковы кіраўнік – А.П. Жытко, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка

пасля 1903 г. фактычна не адлюстравана [9, с. 321]. Агульныя звесткі аб працы Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі з 1900 па 1915 гг. былі пададзены В.В. Шведам [10, с. 122]. Мінскаму таварыству сельскай гаспадаркі прысвяціў артыкул З.В. Шыбека, які даў сціслую характарыстыку структуры і дзейнасці арганізацыі, яе асабовага складу. Канчатковая дата існавання таварыства – 1914 г. – паказана памылкова [11, с. 170]. Як вядома з успамінаў Эдварда Вайніловіча, актыўнага ўдзельніка і апошняга кіраўніка, грамадскае аб'яднанне спыніла сваё існаванне 1 мая 1921 г. [12, с. 331]. Магілёўскае і Віленскае таварыствы сельскай гаспадаркі ўвогуле не знайшлі свайго асвятлення.

Х.Ю. Бейлькін у межах даследавання кааператыўнага руху ў Беларусі разглядаў дробныя сельскагаспадарчыя таварыствы як адзін з тыпаў кааперацыі. Пры гэтым аўтар, не зважаючы на існаванне істотных адрозненняў, падкрэсліваў тоеснасць земляробчых гурткоў і дробных сельскагаспадарчых таварыстваў [13, с. 5, 44–45]. Пры стварэнні сельскагаспадарчых таварыстваў і гурткоў на тэрыторыі Віленскай і Гродзенскай губерняў існавалі даволі сур'ёзныя абмежаванні, якія мелі нацыянальна-канфесійны характар [13, с. 46]. Адзначаючы адсутнасць паўнавартаснай статыстыкі, Х.Ю. Бейлькін выказаў меркаванне аб існаванні перад Першай сусветнай вайной 200–250 сялянскіх гурткоў і таварыстваў [13, с. 47–48]. У адной са сваіх апошніх манаграфій даследчык выдзеліў асобны параграф, прысвечаны сельскагаспадарчым таварыствам. У ім былі разгледжаны праявы эканамічнай дзейнасці створаных пры сельскагаспадарчых таварыствах камерцыйных арганізацый. Пры гэтым статутная дзейнасць таварыстваў амаль цалкам засталася па-за ўвагай даследчыка [14, с. 127–131].

У кантэксце даследавання гісторыі грамадскіх аб'яднанняў і рухаў у Беларусі да праблемы стварэння і дзейнасці таварыстваў сельскай гаспадаркі звярталася М.А. Сакалова. Яна ўпершыню асвятліла нерэалізаваную спробу мінскага дваранства па стварэнні сельскагаспадарчага таварыства яшчэ ў 1859 г. [15, с. 40]. Губернскія сельскагаспадарчыя таварыствы ёй ахарактарызаваны перадусім як навуковыя аб'яднанні, якія былі створаны найбольш актыўнай і прагрэсіўнай часткай памесных дваран і чыноўнікаў [16, с. 30].

Н.Я. Новік у працы, прысвечанай гісторыі прафесійнай адукацыі ў Беларусі, закранула дзейнасць Магілёўскага таварыства сельскай гаспадаркі ў кантэксце стварэння і функцыянавання Зіноўеўскай практычнай школы садаводства [17, арк. 77]. Пазней, дзякуючы пашырэнню крыніцавай базы, даследчыца выявіла ўдзел сельскагаспадарчых таварыстваў у стварэнні і дзейнасці Азярніцкай пачатковай сельскагаспадарчай школы, Лужаснянскага і Варанецкага ніжэйшых сельскагаспадарчых вучылішчаў [18, с. 45–46].

Значны ўклад у вывучэнне гісторыі сельскагаспадарчых таварыстваў зрабіў В.Ф. Бацяеў. У артыкулах, прысвечаных грамадскім аб'яднанням Беларусі XIX – пачатку XX стст., ён упершыню ў беларускай гістарыяграфіі звярнуўся да разгляду прававога боку праблемы заснавання і дзейнасці таварыстваў [19, с. 93–94]. Аўтар упершыню параўнаў арганізацыйную структуру, склад і парадак фарміравання асноўных губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў. Ён указаў, што пашырэнне дзейнасці таварыстваў адбывалася праз стварэнне асобных секцый, камісій, аддзелаў, а таксама арганізацыі суполак (даследчык выкарыстоўвае менавіта гэта азначэнне для рускага «товарищество», такім чынам размяжоўваючы гэтыя аб'яднанні [20, с. 80–83]). Але такое размежаванне больш носіць тэрміналагічны, а не сутнасны характар. У «Часовых правілах аб таварыствах і саюзах» ад 4 сакавіка 1906 г. пад таварыствам разумелася «аб'яднанне некалькіх асоб, якія, не маючы задачай атрымання для сябе прыбытку ад вядзення якога-небудзь прадпрыемства, абралі прадметам сваёй сукупнай дзейнасці пэўную мэту» [21, с. 201]. Такім чынам, заканадаўцы адасобілі грамадскія аб'яднанні ад камерцыйных аб'яднанняў. Уключэнне камерцыйных арганізацый, якімі былі суполкі, у спіс грамадскіх аб'яднанняў з'яўляецца памылковым.

Навукова-асветніцкая дзейнасць таварыстваў характарызавалася правядзеннем статыстычных і агранамічных даследаванняў, абмеркаваннем навуковых паведамленняў, арганізацыяй бібліятэк, сельскагаспадарчых школ, земляробчых гурткоў, курсаў, конкурсаў, экскурсій і выстаў [20, с. 83]. Пачатак ХХ ст. разглядаецца В.Ф. Бацяевым як перыяд актыўнага развіцця грамадскіх сельскагаспадарчых аб’яднанняў, які характарызаваўся стварэннем новых і разрастаннем арганізацыйнай структуры раней узніклых. Аўтар налічыў 212 сельскагаспадарчых аб’яднанняў, большасць з якіх была заснавана ва ўсходніх губернях Беларусі [22, с. 87–88]. Выданне манаграфіі В.Ф. Бацяева, прысвечанай развіццю беларускіх грамадскіх аб’яднанняў у ХІХ – 20-я гг. ХХ ст., з’яўляецца пэўным падсумаваннем яго папярэдніх даследаванняў у гэтым накірунку. Аўтар прапанаваў сваю класіфікацыю грамадскіх аб’яднанняў, у аснове якой ляжыць мэтавы крытэрый. Згодна з імі, сельскагаспадарчыя таварыствы былі аднесены да катэгорыі гаспадарчых грамадскіх аб’яднанняў [23, с. 340].

Да пытання аб ролі сельскагаспадарчых таварystваў у развіцці эканамічнай думкі края звярнуўся В.М. Бусько. Ён прыйшоў да высновы аб пераважна рэгіянальнай накіраванасці эканамічных даследаванняў сяброў Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў. Таварыства найбольшую ўвагу звяртала на пытанні агульнага стану сельскай і лясной гаспадаркі, ільняной прамысловасці, шляхоў зносін і знешніх эканамічных сувязяў [24, с. 201].

А.Л. Кіштымаў у сваім даследаванні прыйшоў да высновы, што выставачная дзейнасць сельскагаспадарчых таварыстваў была найбольш актыўнай сярод грамадскіх аб’яднанняў. Аўтар адзначыў актывізацыю губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў у гэтым напрамку з 80-х гг. ХІХ ст. Асабліва было выдзелена Мінскае таварыства, якое стала арганізатарам розных спецыялізаваных і ўніверсальных выстаў [25, с. 9–10].

Пэўныя аспекты дзейнасці таварыстваў закрануў А.П. Жытко. Даследчык прыйшоў да высновы, што менавіта дзякуючы сельскагаспадарчым таварыствам адбыўся пераход да практычнага ўкаранення найноўшых дасягненняў тагачаснай сельскагаспадарчай навукі [26, с. 141]. А.П. Жытко звярнуў увагу на нерэалізаваную ініцыятыву віцебскага дваранства па стварэнні сельскагаспадарчага таварыства ў 1862 г. [26, с. 204].

В.А. Шаршуноў зрабіў спробу разгледзець таварыствы сельскай гаспадаркі як навуковыя арганізацыі. Яго асноўную ўвагу прыцягнулі праявы выдавецкай дзейнасці сяброў найбольш буйных таварыстваў сельскай гаспадаркі краю. Акрамя навуковага накірунку, аўтар закрануў элементы камерцыйнай дзейнасці і стварэнне пад патранажам сяброў таварыстваў камерцыйных арганізацый. Разам з тым В.А. Шаршуноў паўтарае памылкі сваіх папярэднікаў, якія атаясамлівалі таварыствы і суполкі, зыходзячы толькі з іх агульнага падабенства назваў [27, с. 75].

Да пытанняў утварэння і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў звярнуўся А.Ф. Смалянчук. Аўтар акцэнтуе ўвагу на грамадскай і гаспадарчай значнасці таварыстваў, іх ролі ў супраціўленні русіфікацыйным і антыпольскім захадам. Ён першы ў беларускай гістарыяграфіі адзначыў першапачатковую мэту стварэння губернскіх сельскагаспадарчых таварыстваў як арганізацый па падтрымцы рускага землеўладання. Найбольш паспяховым аб’яднаннем, па меркаванні даследчыка, было Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі, якое спрабавала гаспадарчай актыўнасцю кампенсаваць адсутнасць палітычных правоў [28, с. 92–93]. У.С. Пуцік звярнуўся да такога маладаследаванага аспекту, як удзел таварыстваў ва ўрадавых праграмах па абмеркаванні аграрнага заканадаўства і самакіравання ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стст. [29, с. 5–6; 30, с. 57–59].

Першую спробу асэнсавання польскай гістарыяграфіі дзейнасці Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі зрабіў І. Мельнікаў. Даследчык прыйшоў да высновы аб даволі доўгім і глыбокім вывучэнні дзейнасці таварыства, якое пачалося яшчэ ў дарэвалюцыйны перыяд і працягваецца ў сучаснай Польшчы. Аднак пры гэтым аўтар абмінуў

перыяд 1939–1989 гг. [31, с. 108–115]. У некалькіх артыкулах І. Мельнікаў звяртаўся да вывучэння ініцыятыў і іх рэалізацыі па стварэнні камерцыйных арганізацый пры сельскагаспадарчых таварыствах у беларуска-літоўскіх губернях. Разгледзеўшы дзейнасць крэдытна-фінансавых і страхавых арганізацый, якія былі створаны Мінскім таварыствам сельскай гаспадаркі, аўтар прыйшоў да высновы аб тым, што апошнія ў значнай ступені спрыялі мадэрнізацыі эканомікі Беларуска-Літоўскага краю. Акрамя таго, яны дапамаглі захаваць пазіцыі памеснага дваранства ў рэгіёне ва ўмовах абмежавальнага заканадаўства [32, с. 69]. Акрамя ініцыятыў Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, даследчыкам былі разгледжаны падобныя захады Віцебскага і Віленскага таварыстваў. Дзейнасць іншых губернскіх таварыстваў у гэтым накірунку засталася не даследавана [33, с. 68–69].

Выданне даведнікаў па Мінскай і Віцебскай губернях ў пэўным сэнсе з'яўляецца паказчыкам разумення статуса сельскагаспадарчых таварыстваў у сістэме грамадскіх аб'яднанняў. З 4 сельскагаспадарчых таварыстваў да грамадскіх аб'яднанняў укладальнікі аднеслі толькі Беларускае вольнае эканамічнае таварыства [34, с. 397–399]. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі і Мінскі аддзел Расійскага таварыства садоўніцтва былі аднесены да гаспадарча-эканамічных устаноў і арганізацый [35, с. 225–228]. Туды ж аднеслі і Віцебскае таварыства сельскіх гаспадароў [34, с. 338–340].

**Заключэнне**

Сучасная айчынная гістарыяграфія сельскагаспадарчых таварыстваў Беларусі другой паловы ХІХ – пачатку ХХ стст., абапіраючыся на напрацоўкі савецкага перыяду, зрабіла пэўны крок наперад. Беларускія навукоўцы звярнуліся да даследавання стварэння і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў. Пашырэнне крыніцавай базы дазволіла акрэсліць перыяд стварэння, арганізацыйны склад, структуру, асноўныя накірункі дзейнасці найбольш буйных сельскагаспадарчых таварыстваў. Аднак маладаследаванымі застаюцца дзяржаўная палітыка ў працэсе стварэння сельскагаспадарчых таварыстваў, узаемаадносіны таварыстваў і адміністрацыі, асабовы склад, асветніцкая дзейнасць. Дагэтуль не вызначаны змест самога тэрміна «сельскагаспадарчыя таварыствы», што спараджае тэрміналагічную блытаніну і ўключэнне ў іх шэраг камерцыйных аб'яднанняў. Гэта, у сваю чаргу, ставіць пад сумніў атрыманыя звесткі аб колькасці сельскагаспадарчых таварыстваў, прыводзіць да памылковых высноў аб іх дзейнасці. Сярод таварыстваў найбольш даследаваны стварэнне і дзейнасць Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. Іншым губернскім, а яшчэ ў большай ступені павятовым і дробнараённым таварыствам надавалася значна менш увагі. Трэба падкрэсліць што даследчыкі разглядалі факты стварэння і дзейнасці сельскагаспадарчых таварыстваў толькі ў кантэсце сваіх даследаванняў; за рэдкім выключэннем, яны не выкарыстоўвалі напрацоўкі сваіх папярэднікаў. Такім чынам, вызначэнне ролі і месца сельскагаспадарчых таварыстваў ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў парэформенны перыяд застаецца актуальным і патрабуе спецыяльнага асвятлення.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Батяев, В. Ф. Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е гг. XX в. Этнологическое исследование : автореф. дис. … д-ра ист. наук : 07.00.07 / В. Ф. Батяев ; ИИЭФ. – Минск, 2011. – 50 с.

2. Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. II половина XIX в. / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 256 с.

3. Самбук, С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук ; под ред. В. П. Панютича. – Минск : Наука и техника, 1980. – 224 с.

4. Бейлькин, Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. 1861–1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин ; под. ред. М. О. Бича. – Минск : Наука и техника, 1989. – 288 с.

5. Бусько, В. М. Беларускія сельскагаспадарчыя таварыствы (канец XIX – пачатак XX ст.) / В. М. Бусько // Вес. АН БССР. Сер. грам. навук. – 1987. – № 1. – С. 39–46.

6. Бусько, В. Н. Экономическая мысль Белоруссии середины XIX – начала XX в. : очерки / В. Н. Бусько ; под ред. М. В. Научителя. – Минск : Наука и техника, 1990. – 144 с.

7. Пичуков, В. Сельскохозяйственная пресса Могилёвской губернии в конце XIX – начале XX вв. / В. Пичуков // Могилёвщина : сб. ст. / Могилёв. гос. пед. ин-т. ; сост. и отв. ред. В. А. Юшкевич. – Могилёв, 1991. – С. 46–47.

8. Пичуков, В. П. Малоизвестные издания сельскохозяйственных обществ Могилевской губернии / В. П. Пичуков // Чарнобыль і духоўная спадчына беларускага народа : матэрыялы навук. чытанняў, Гомель, 25 крас. 1991 г. / М-ва народнай адукацыі БССР, Гомел. дзярж. ун-т ; пад рэд. У. І. Каваля. – Гомель, 1991. – С. 86–87.

9. Верабей, М. В. Віцебскае таварыства сельскіх гаспадароў / М. В. Верабей // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 2. – Мінск, 1994. – С. 321.

10. Швед, В. Гродзенскае таварыства сельскай гаспадаркі / В. Швед // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 122.

11. Шыбека, З. Мінскае таварыства сельскай гаспадаркі / З. Шыбека // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 5. – Мінск, 1999. – С. 170.

12. Woyniłłowicz, E. Wspomnienia 1847–1928, część pierwsa / E. Woyniłłowicz. – Wilno : Druk J. Zawadzkiego, 1931. – 368 s.

13. Бейлькин, Х. Ю. Кооперативное движение в Беларуси (эпоха капитализма) / Х. Ю. Бейлькин. – Гомель : ГКИ, 1998. – 79 с.

14. Бейлькин, Х. Ю. Капиталистическая трансформация сельского хозяйства Беларуси в начале XX в. (1901–1914 гг.) / Х. Ю. Бейлькин. – Гомель : ЦИИР, 2006. – 296 с.

15. Соколова, М. А. Общественные объединения и движения в Беларуси в конце XVIII – начале XX в.: проблемы становления гражданского общества / М. А. Соколова ; НАН Беларуси, Ин-т ист. – Минск, 2002. – 134 с.

16. Сакалова, М. Легальныя грамадскія арганізацыі Беларусі ў 70–90-я гг. XIX ст. / М. Сакалова // Беларус. гіст. часоп. – 1999. – № 3. – С. 29–32.

17. Новик, Н. Е. Профессиональное образование в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Н. Е. Новик. – Минск, 1998. – 129 л.

18. Новік, Н. Я. Сельскагаспадарчая адукацыя як фактар аграрнай мадэрнізацыі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. / Н. Я. Новік // Беларус. гіст. часоп. – 2009. – № 10. – С. 43–48.

19. Бацяеў, В. Ф. Грамадскія аб’яднанні беларусаў: станаўленне і развіццё / В. Ф. Бацяеў // Вес. НАН Беларусі. Сер. гум. навук. – 1999. – № 4. – С. 92–97.

20. Бацяеў, В. Ф. Грамадскія сельскагаспадарчыя аб’яднанні беларусаў у XIX ст. / В. Ф. Бацяеў // Вес. НАН Беларусі. Сер. гум. навук. – 2000. – № 2. – С. 79–84.

21. О временных правилах об обществах и союзах // Полн. собр. законов Рос. империи. – 3-е собр. – отд. I. – Т. 26. – № 27479.

22. Бацяеў, В. Ф. Развіццё грамадскіх сельскагаспадарчых аб’яднанняў беларусаў ў пачатку XX ст. / В. Ф. Бацяеў // Вес. НАН Беларусі. Сер. гум. навук. – 2000. – № 4. – С. 87–92.

23. Батяев, В. Ф. Развитие белорусских общественных объединений в XIX – 20-е годы XX века. Этнологическое исследование / В. Ф. Батяев ; под науч. ред. А. И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2007. – 381 с.

24. Бусько, В. Н. Витебское общество сельских хозяев и его роль в развитии экономической мысли края / В. Н. Бусько // Беларусь и Европа: взаимодействие культур (история, уроки, опыт, современность) : материалы междунар. науч.-практ. конф., Ви-

тебск, 30 нояб. – 1 дек. 2000 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: В.А. Космач [и др.]. – Витебск, 2000. – С. 195–202.

25. Киштымов, А. Л. Беларусь на выставках XIX – начала XX в. : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / А. Л. Киштымов ; Ин-т ист. НАН Беларуси. – Минск, 2001. – 22 с.

26. Жытко, А. П. Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 / А. П. Жытко ; пад рэд. В. М. Фаміна. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.

27. Шаршунов, В. А. Деятельность научных обществ и губернских комитетов по развитию сельского хозяйства в дореволюционной Беларуси / В. А. Шаршунов // Изв. НАН Беларуси. Сер. агр. наук. – 2003. – № 4. – С. 72–77.

28. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–1917 гг. / А. Ф. Смалянчук. – 2-е выд., дап. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

29. Пуцік, У. С. Таварыствы сельскай гаспадаркі Паўночна-Заходняга краю ў канцы XIX – пачатку XX ст. (агляд матэрыялаў пасяджэнняў) / У. С. Пуцік // Весн. Беларус. дзярж. пед. ун-та. Сер. 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – № 4. – С. 3–8.

30. Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму : у 5 ч. / рэдкал.: А. П. Жытко (агул. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2005–2011. – Ч. 1. Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / А. П. Жытко [і інш.]. – 2005. – 138 с.

31. Мельнікаў, І. Польская гістарыяграфія дзейнасці Мінскага сельскагаспадарчага таварыства / І. Мельнікаў // Знакамітыя мінчане : матэрыялы бел.-пол. навук. канф., Мінск, 9 ліст. 2004 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А. Вялікі [і інш.]. – Мінск ; Вроцлаў, 2005. – С. 108–115.

32. Мельнікаў, І. Да пытання страхавой і крэдытна-фінансавай дзейнасці / І. Мельнікаў // Банк. весн. – 2011. – № 16. – С. 67–69.

33. Мельнікаў, І. Па старонках гісторыі дваранскіх крэдытна-фінансавых арганізацый / І. Мельнікаў // Банк. весн. – 2011. – № 31. – С. 68–69.

34. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Департамент по архивам и делопроизводству Мин-ва юстиции Респ. Беларусь, Нац. ист. архив Беларуси ; сост.: Т. Е. Леонтьева [и др.] ; редкол.: А. К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2009. – 524 с.

35. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / Комитет по архивам и делопроизводству при Совете Министров Респ. Беларусь ; сост. Т. Е. Леонтьева ; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2006. – 392 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.05.1014

***Buchaviec P.P.*** **Modern Belarusian Historiography of Agricultural Societies of Belarus in the Second Half of XIX – the Beginning of the XX centuries**

*The article is devoted to consideration by modern Belarusian historiography of creation and activity of agricultural associations in the second half of the XIX – the beginnings of the XX centuries. The analysis of Belarusian researchers' works testifies to indirect studying of this problem in our historical science. Now there is no conventional definition of «agricultural association» that generates terminological confusion and inclusion in their number of commercial associations. The expansion of source base in the last quarter of the century allowed to outline organizational membership, structure, the main activities of the largest agricultural associations. At the same time, such aspects as the factor of state politics in the process of creation of agricultural associations, the relationship of associations and power vertical, specific construction and educational activity remain underexamined.*